Дзяржаўны патэнтны камітэт рэспублікі сістэматычна ажыццяўляе афіцыйную інфармацыю аб зарэгістраваных аб'ектах прамысловай уласнасці. З 1994 года "Афіцыйны бюлетэнь" адзін раз у квартал паведамляў аб вынаходствах, карысных мадэлях, прамысловых узорах, таварных знаках. З 1999 года бюлетэнь Дзяржпатэнта выдаецца асобнымі выпускамі "Вынаходствы. Карысныя мадэлі. Прамысловыя ўзоры" і "Таварныя знакі". Бюлетэні выходзяць штоквартальна, кожны выпуск мае наступныя раздзелы: афіцыйныя паведамленні, дзе публікуюцца нарматыўна-прававыя дакументы, а потым - раздзелы, у якіх змяшчаецца інфармацыя аб адпаведным аб'екце прамысловай уласнасці - вынаходніцтва, карысныя мадэлі і г.д. Сістэматызацыя матэрыяла ажыццяўляецца па адпаведнай міжнароднай класіфікацыі - МПК, МКПУ і г.д. Акрамя таго друкуюцца паведамленні, інфармацыя, аб'явы.

З 1997 года ў адпаведнасці з Законам РБ "О патентах на сорта растений" Дзяржпатэнт 2 разы ў год выпускае яшчэ адзін Афіцыйны бюлетэнь "Сарты раслін", у якім публікуюцца звесткі аб паступіўшых заяўках, ліцэнзійных дагаворах, звесткі аб патэнтах, заканадаўчыя і нарматыўна-прававыя акты па сартах раслін. У бюлетэні друкуецца Дзяржаўны реестр ахоўных сартоў раслін і іх афіцыйныя апісанні.

Вучэбна-даследчы цэнтр прамысловай уласнасці Дзяржпатэнта з 1997 года два разы ў год выпускае "Каталог научно-технических разработок" (29(1997 г.)), у якім у адпаведнасці з галіновымі катэгорыямі Міжнароднага Банка Даных ліцэнзіруемых тэхналогій змяшчаюцца звесткі аб айчынных інавацыйных распрацоўках.

Звяртае на сябе ўвагу група дапаможнікаў, у якіх адлюстраваны нарматыўныя дакументы, падрыхтаваныя Дзяржаўным камітэтам па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі Рэспублікі Беларусь. Сярод іх чарговыя штогадовыя выпускі "Каталога нормативных документов по стандартизации" (30(1997 г.), 26(1999 г.), 31-32(2000 г.)). Гэтыя каталогі змяшчаюць інфармацыю аб усіх стандартах РБ (СТБ, РСТ БССР, РСТ Беларусі), кіруючых дакументах і класіфікатарах, зацверджаных Белстандартам, а таксама аб междзяржаўных стандартах і дзяржаўных стандартах РФ, прынятых у якасці дзяржаўных стандартаў РБ.

Акрамя таго, як дадатак да інфармацыйнага зборніка "Новости. Стандартизация и сертификация" выдадзены інфармацыйныя паказальнікі "ИУС РБ. Стандарты" (30 (2000 г.)), якія выходзяць адзін раз у два месяцы і ўтрымліваюць звесткі аб дзяржаўных стандартах РБ, междзяржаўных і міжнародных стандартах.

Інфармацыю аб іншых відах нарматыўных дакументаў утрымлівае каталог "Технические условия" (21(1996 г.), 2226(1999 г.)), які падрыхтаваны ў 2-х тамах аб дзейнічаючых дакументах па стану на бягучы год.

Сярод універсальных па зместу неабходна назваць два дапаможнікі БелІСА, якія рыхтуюцца ў адпаведнасці з Пастановай Савета Міністраў РБ аб фарміраванні банка данных аб навукова-тэхнічным патэнцыяле рэспублікі і выніках НДР і ВКР. Паказальнік "Бюллетень регистрации НИР, ОКР, ОТР" (2433(2000 г.)) з'яўляецца перыядычным выданнем, якое ўтрымлівае пералік назваў зарэгістраваных у інстытуце работ. Сістэматызацыя ажыццяўляецца па рубрыках дзяржаўнага рубрыкатара навукова-тэхнічнай інфармацыі, а ўнутры рубрык - па нумарах дзяржаўнай рэгістрацыі. Другое выданне інстытута "Реферативный сборник неопубликуемых работ. Отчеты НИР, ОКР, ОТР, депонированные научные рукописи" (2225(1999 г.)) уключае рэфераты завершаных навуковых і дэпаніраваных работ.

Разглядаючы бібліяграфічныя рэсурсы па тэхніцы, неабходна адзначыць ролю РНТБ, якая з'яўляецца галаўным цэнтрам у рэспубліцы па бібліяграфаванню тэхнічнай літаратуры. Бібліятэкай за разглядаемы перыяд падрыхтаваны шэраг рэтраспектыўных дапаможнікаў па актуальнай тэматыцы. Усе яны падрыхтаваны па адзінай методыцы - адлюстроўваюць айчынную і замежную літаратуру - кнігі, артыкулы, інфармацыйныя матэрыялы, патэнтную і нарматыўна-тэхнічную дакументацыю. У дапаможніках, як правіла, ёсць прадмова, справачны апарат. Абсалютная большасць дапаможнікаў уключае звесткі аб дакументах за апошнія 3-5 гадоў. Да такіх паказальнікаў адносяцца "Энергосберегающие технологии и оборудование" (2437(1998 г.)), "Экономия материалов в машиностроении" (2245(1999 г.)) і інш. Але сярод выданняў РНТБ ёсць і такія, у якіх літаратура адлюстравана за значна большы адрэзак часу. Напрыклад, "Переработка отходов" (2871(1998 г.)), "История развития изобретательства в Беларуси" (1доп.(2000 г.)). Гэты рэтраспектыўны паказальнік (ч. II) уключае выданні за 1945-1995 гг., якія падрыхтаваны беларускімі аўтарамі ці надрукаваны на тэрыторыі Беларусі.

Акрамя РНТБ у падрыхтоўцы паказальнікаў прымалі ўдзел і іншыя бібліятэкі. Нацыянальная бібліятэка падрыхтавала чарговыя паказальнікі "Чарнобыль" (2466(1998 г.), 2465(2000 г.)) з удзелам галіновых бібліятэк дзяржавы. Дарожны цэнтр навукова-тэхнічнай інфармацыі падрыхтаваў паказальнік літаратуры "Белорусской железной дороге - 125 лет" (1763(1996 г.)), які адлюстроўвае дакументы з 1977 па 1996 год.

Традыцыйным для масіву бібліяграфічнай прадукцыі з'яўляецца наяўнасць біябібліяграфічных паказальнікаў. За разглядаемы перыяд падрыхтаваны паказальнікі, прысвечаныя А.Д. Янушка (2606 (2000 г.)), М.І. Фёдараву (2605(2000 г.)), дактарам навук ЦНДІКВВР. На жаль, невялікая колькасць паказальнікаў практычна не дае магчымасці весці размову аб забеспячэнні бібліяграфічнай прадукцыяй спецыялістаў асобных галін тэхнікі.

## Библиографические пособия по сельскому хозяйству

В.А. Касап, Р.А. Ровина

Сельское хозяйство всегда являлось одной из приоритетных отраслей народного хозяйства Беларуси, в связи с чем библиографические списки и указатели сельскохозяйственной литературы начали выходить еще в 19 веке. К сожалению, за период 1996-2000 гг. их количество продолжает сокращаться. Эта негативная тенденция началась в конце 80-х годов и к настоящему времени можно констатировать развал системы традиционной библиографической продукции, напечатанной на бумажном носителе. Даже по



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сравнению с 1991-1995 гг. количество вышедших указателей сократилось в 2 раза - с 29 до 15. Наблюдается и дальнейшее сокращение выпущенных указателей по годам - с 4-5 в начале исследуемого периода - до 1-2 в конце.

В отличие от предыдущих лет в подготовке библиографической продукции почти не принимают участие библиотеки. В основном среди составителей следует отметить редколлегии издательств отдельных ученых, учебно-методический центр Министерства сельского хозяйства и продовольствия РБ, вузы и др. Единственный указатель »Оборудование для переработки плодов и овощей» был подготовлен Республиканской научно-технической библиотекой (1963(1996 г.)). Исходя из этого не наблюдается единства в библиографировании документов, их отборе и оформлении библиографической продукции.

Среди подготовленных указателей преобладают самостоятельные издания, внутри книг помещено 5 указателей и списков. В потоке преобладают биобиблиографические и персональные пособия, составленные к юбилеям ученых А.Г. Медведева (2693(1998 г.)), Я.Н. Афанасьева (2710(1998 г.)), А. Горецкого (2641(1998 г.)), А.П. Святогора (1772(1996 г.)), В.В. Валуева (2330(1997 г.)), В.Н. Кондратьева (2295(1997 г.)), В.Ф. Самерсова (2316(1997 г.)). В этой связи следует особо отметить серию биобиблиографических указателей БСХА "Выдающиеся педагоги и воспитанники БСХА" (1142(1999 г.)), основанную в 1996 году.

Все вышедшие биобиблиографические указатели построены по классической схеме: биографический очерк, список научных трудов, литература о жизни и деятельности ученого. Иногда основной библиографический раздел подразделяется либо по видам написанных работ (книги, рецензии, сборники научных трудов, вышедшие под редакцией... и др.). Иногда, как в списке трудов А.Г. Медведева, материал расположен по темам написанных работ. Очень часто в основном разделе указателя материал располагается в хронологическом порядке. Из всех биобиблиографических указателей и персональных списков больше всего соответствует методике библиографирования указатель трудов В.Н. Кондратьева. Однако название его не соответствует ГОСТ. Чаще всего в указателях библиографическое описание отраженных документов не соответствует ГОСТ.

В связи с включением сельского хозяйства в аграрно-промышленный комплекс представляет значение указатель, составленный РНТБ "Оборудование для переработки плодов и овощей" (1963(1996 г.)). Указатель составлен с учетом классических требований методики библиографирования. Он содержит разнообразные виды документов, в том числе и патентную документацию, и промышленные каталоги, и нормативно-техническую документацию за 1987-1995 гг. Указатель систематический, имеется алфавитный вспомогательный указатель.

Примером пособия, отражающего один жанр документов - учебно-методическую литературу, является подготовленный учебно-методическим центром Министерства сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь "Аннотированный перечень учебно-методической литературы, изданной в... году (2642(1998 г.)). Издание выходит ежегодно с 1997 года и является полезным для студентов сельскохозяйственных вузов, техникумов, СПТУ, преподавателей, мастеров профессионального образования. Указатель аннотирован. Однако, несмотря на его значимость и актуальность, нельзя согласиться с методическими приемами его подготовки: отсутствием оглавления, предисловия, не соответствующим ГОСТ библиографическим описанием документов. Это значительно снижает ценность такого пособия.

Все большее значение в настоящее время приобретают электронные информационные ресурсы и многие библиотеки имеют электронные каталоги, составляют тематические базы данных. Однако основные производственные сельскохозяйственные кадры сосредоточены в сельской местности, где остро ощущается нехватка новой информации. В этой связи думаю, что библиотеки республики должны обратить внимание и на потребности специалистов, механизаторов сельского хозяйства, которым необходимы профессионально-производственные, рекомендательные указатели, списки новых поступлений отраслевой литературы в библиотеки области.

## Бібліяграфічныя дапаможнікі па мастацкай літаратуры і літаратуразнаўству

В.М. Бяреза, Э.С. Суддзя

Бібліяграфічная аснапічанасць мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства ў значнай ступені залежыць ад творчай актыўнасці ў гэтай галіне бібліятэк, ВНУ рэспублікі філалагічнага профілю, навуковых інстытутаў АН Беларусі, літаратурных музеяў, часопісаў і профільных фірм.

Калі ацэньваць іх уклад у бібліяграфічную стабільнасць разглядаемага пяцігоддзя, то неабходна адзначыць больш плённую працу аўтараў Беларускага дзяржаўнага універсітэта, часопіса "Дыялог" і "Роднае слова".

Цікавасць ўяўляюць таксама бібліяграфічныя прадукты, падрыхтаваныя супрацоўнікамі Нацыянальнай бібліятэкі, Акадэміі навук РБ. На жаль, яўна недастатковая актыўнасць у гэтым накірунку бібліятэк рэспублікі і музеяў.

Працягваюць выдаваць бягучыя крыніцы інфармацыі аб навінках мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства - "Беларуская мова, літаратура і мастацтва"(2118(1996 г.), 2665(1997 г.), 3188(1998 г.), 2979(1999 г.), 3112(2000 г.)) , спецыяльныя раздзелы ў "Летапісу друку Беларусі";(4(1996-2000 гг.)), "Новых кнігах"6(1996 г.), 6(1997 г.), 5(1999 г.), 6(2000 г.)). У дадатках да апошніх апублікаваны рэкамендацыйныя спісы літаратуры, прысвечаныя беларускім пісьменнікам, паэтам, крытыкам, літаратуразнаўцам. Сярод іх: Сімяон Полацкі, А. Савіцкі, Д. Бугаеў, В. Хомчанка, А. Міцкевіч, Б. Спрынчан, А. Грачанікаў, Я. Янішчыц, У. Мехаў, Я. Маўр, С. Аляксіевіч і інш. Цікавасць да навінак даволі ўстойлівая, шматпланавая і разнастайная па складу карыстальнікаў: ад навуковых супрацоўнікаў, літаратурных